15. Шмерлина, И. Подарок как «социальная вещь» / И. Шмерлина // Социальная реальность. – 2007. – № 5. – С. 31 – 45.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена изучению связи экономического поведения и конструирования социальных отношений в современном обществе. Анализируется феномен дарообмена, его функции, роль в социальных отношениях. Показывается, насколько типично для современного общества престижное потребление и как появление Интернета повлияло на социальные связи.

SUMMARY

The article is devoted to the study of the connection between economic behavior and the construction of social relations in modern society. The phenomenon of gift exchange, its functions, and role in social relations are analyzed. It is shown how prestigious consumption is characteristic of modern society and how the emergence of the Internet has affected social ties.

***Новак В. С.***

## КАЛЯДНА-НАВАГОДНЯЯ АБРАДНАСЦЬ ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 15.09.2022)*

Асноўныя структурныя кампаненты калядна-навагодняга абрадавага комплексу Веткаўскага раёна – гэта падрыхтоўка абрадавай стравы (куцці), прымеркаванай адпаведна да святкавання Ражаства, Новага года і Вадохрышча, прыкметы і павер'і, звязаныя з першай, другой і трэцяй куццёй, абходныя шэсці калядоўшчыкаў, рытуальныя дыялогі, гульні, варажба, запальванне вогнішча, выкананне зімовых песень. Як адзначылі жыхары, напярэдадні святкавання Ражаства абавязкова хадзілі ў царкву: *«Перад Ражаством быў пост і накануне гатаваліся сільна. Потым на вечар ішлі ў царкву. Варылі куццю і ставілі пад абраза на сена. Калі прыходзілі з цэркві, ужыналі і елі эту куццю і ўсякую пішчу. Зажыгалі свечку і праізносілі*

*малітву»* (зап. ад Вольгі Рыгораўны Воінавай, 1925 г. н., у г. Ветка)[1]. Першую куццю называлі поснай: *«Напярэдадні Каляд налажваюць галодную куццю, гэта значыць, посную вячэру. Пачыналі вячэру з усходам першай звязды, якая абазначала раджэнне Хрыста»* (зап. ад Таццяны Міхайлаўны Паўлючэнка, 1953 г. н., у в. Глухаўка). Зыходзячы са сведчанняў інфармантаў, у іх свядомасці абрадавая страва (куцця) у калядна-навагодніх святкаваннях мела выразны дыферэнцыраваны характар: *«Да Божа мой, вот, напрымер, Каляды: куцця первая посная, а втарая ета шчодраная (скаромная), трэцяя – крашчэнская – ета посная»* (в. Шарсцін) [1, с. 30]. Заслугоўвае ўвагі тлумачэнне мясцовымі жыхарамі, чаму на стол клалі сена, калі рыхтаваліся да святкавання Каляд: *«Куццю варылі. Гэта была каша з пшаніцы, унасілі ў хату, ставілі на кут. Яна тутака і стаяла з утра да вечара. Стаяла яна на сене: на стале – сена, а зверху тканіна. Сена была, каб каровы добрае малако давалі і не захворвалі»* (в. Шарсцін) [1, с. 31]. З семантыкай пладавітасці свойскіх жывёл і ўраджайнасцю садавіны звязвалі сена і ў вёсках Глухаўка і Новы Мір: *«Салому, што клалі пад скацерць, раніцай аддавалі сваёй жывёле, каб была плоднасць. Ім жа абвязвалі пладовыя дрэвы, штоб быў ураджай»* (зап. ад Т. М. Паўлючэнка ў в. Глухаўка); *«Самай раніцай узяць сена ета, у якім куцця стаяла, і аддаць карове»* (в. Новы Мір) [1, с. 34]. У в. Старое Сяло абавязкова выкарыстоўвалі салому, каб засцерагчыся ад звышнатуральнага ўздзеяння нячыстай сілы, а таксама ўміласцівіць дамавіка: *«Салому клалі пад парог, каб зашчыціцца ад чорта, ад злых духаў. Як мамка казала, гэта як пасцелька дамавічку»* [1, с. 39]. У вёсцы Глухаўка *«пад скацерць клалі салому, штоб год быў багаты і мяккі»* (зап. ад Т. М. Паўлючэнка). Паводле ўспамінаў жыхароў вёскі Хальч, *«пад абрус клалі сена, каб быў добры надой, і так аберагалі жывёлу ад ваўкоў»* (зап. ад Антаніны Міхайлаўны Бастрыкінай, 1938 г. н.). Акрамя сена, важным прадметным атрыбутам, якому надавалася таксама магічнае

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

значэнне, з'яўляўся ручнік. Ім трэба было абгарнуць гаршчок з куццёй, калі ставілі яго на покуць: *«Сычталі, што сена з покуці прынясе скаціне павялічэнне пагалоўя, а тым рушніком, на якім стаяла куцця, уся сям'я ўціралася. Счыталі, што гэты ручнік сціраў усе грахі і прыносіў дастатак у хату»* (в. Прысно) [1, с. 59].

У структуры зімовай абраднасці Веткаўшчыны важнае месца адводзілася звычаю заклінаць мароз, клікаць яго на вячэру, што адлюстроўвала міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з культам продкаў. Рытуал або адбываўся на ўсе тры куцці, або быў прымеркаваны толькі да першай, другой ці трэцяй куцці. Як сведчаць фактычныя матэрыялы, на тэрыторыі Веткаўшчыны пераважаюць звесткі пра выкананне гэтага звычаю на першую і на трэцюю куццю, зрэдку – на другую куццю. Напрыклад, у вёсцы Глыбаўка заклікалі мароз на першую куццю: *«Яна называлася посная, бо без тлушчу. Мароза звалі: "Мароз, мароз, хадзі гушчу есць, улетку не хадзі, не белі, мароз, гуркоў, хадзі зімою гушчу есці з намі"»* [1, с. 97]. У вёсцы Свяцілавічы менавіта на другую куццю клікалі мароз на вячэру: *«На Стары Новы Год кашу варaць у печы – то і ёсць куцця. Вечарам яе ядуць. Бяруць у ложку трохі куцці, ідуць да вакна і кажуць: "Мароз, мароз, ідзі куццю есці"»* [1, с. 94]. У вёсцы Янова рытуал заклінання марозу таксама быў звязаны з другой куццёй: *«Другая куцця шчодрая. На яе заклікалі мароз: "Мароз-мароз, хадзі гушчу есці"»* [1, с. 90]. Адзначым, што ў вёсцы Янова рытуал заклінання марозу выконвалі таксама і на трэцюю куццю, і суправаджаўся ён не толькі славеснай формулай, але і падрыхтоўкай спецыяльнага прадметнага атрыбута – «храшчоў»: *« "Мароз, мароз, хадзі гушчу есць, улетку не бывай, цвяткоў з гуркоў не з'ядай". Каб засцерагчыся ад нячыстай сілы, кідаюць у калодзеж "храшчы". Робяць іх з палак. Пойдзеш па ваду. Калі пападзецца ў вядро храшч, прыносяць дамоў і год яго захоўваюць. Забабон такі існуе, што ратуе ад нячыстай сілы»* (зап. ад Лукер'і Харытонаўны Ісачанка, 1920 г. н.).

Традыцыйны рытуал заклінання марозу меў адметную мясцовую форму выканання ў вёсцы Акшынка: *«Калі вымаюць кашу, то выходзяць на двор і*

*пугай сякуць мароз, прыгаворваючы: "Не ідзі, мароз, нам бульбу марозіць, а ідзі кашу есці»* (зап. у г. Гомелі ад Л. І. Гусаковай, 1907 г. н., перасяленкі з в. Акшынка Веткаўскага р-на). Мэтай прыведзенага дыялогу з'яўлялася заклінанне будучага ўраджаю: *«Садзіліся мы, і сразу жэ самы старэйшы – бацька, значыць, уставаў і гаварыў з марозам: "Ой, Мароз, Мароз Іванавіч, не марозь ты нас увёсну, улету, а марозь сяйчас, прынясі ж нам харошы ўраджай»* (в. Старое Сяло) [1, с. 39]. Матэрыялы фальклорнай экспедыцыі, праведзенай улетку 2022 г. у вёсках Веткаўскага раёна, далі магчымасць пераканацца ва ўстойлівасці бытавання звычаю заклінання марозу і захавання звестак у народнай памяці: *«Мароз клікалі, выносілі куццю на двор і крычалі: "Мароз, мароз, хадзі к нам куццю есці. Не марозь нас, не авёс, не гряды, не бульбу, нішто"»* (зап. ад Лідзіі Ільінічны Малашчанка, 1932 г. н., у в. Пералёўка).

У вёсцы Неглюбка з першай куццёй быў звязаны цікавы звычай «аб'язджаць» коней, а *«мароз гукалі толькі на трэцюю куццю, на храшчэнскую»* (зап. ад Ульяны Мікалаеўны Саломеннай, 1932 г. н.), прычым у славеснай формуле-заклінанні гучаў матыў не толькі забароны шкодзіць улетку, але і пагрозы расправіцца: *«Мароз, мароз, хадзі гушчу есці, улетку не бывай, цвятоў не збівай, а то будзем жалезнай пугай цябе біць»* (зап. ад У. М. Саломеннай). У пераважнай большасці вёсак Веткаўскага раёна, як засведчылі інфарманты, заклінялі мароз на трэцюю куццю.

Абрады калядавання (на Каляды) і шчадравання (пад Новы год) у вёсках Веткаўскага раёна арганічна сумяшчаліся як з ваджэннем казы, пераапрананнем у цыган, так і са звычаем насіць «зорку»: *«Калядоўшчыкі хадзілі з казой і звязду насілі, пелі:*

*А ў полі, полі вішанька стаіць,*

*На той вішанькі свечачка гарыць.*

*Пад той вішанькай рэчачка бяжыць.*

*Свечачка ўпала, рэчачка ўстала.*

*А ў той рэчачцы Гасподзь купаўся,*

*Гасподзь купаўся з Ісусам Хрыстом,*

*З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством»* (в. Прысно) [1, с. 85].

Паводле сведчанняў інфармантаў, на Каляды хадзілі ў «цыганкі»: *«Дзеўкі і жанчыны завязвалі на галаве платкі з бахрамой, каб бахрама вісела на ліцо, рожкі завязвалі на галаве, абмотваліся скацерцю. І пачынаюць хадзіць па хатах, спяваюць песню, варожаць, дзякуюць за падарункі і ідуць у другую хату»* (зап. у г. Гомелі ад Л. І. Гусаковай, перасяленкі з в. Акшынка Веткаўскага р-на). У вёсцы Акшынка вадзілі і казу, і мядзведзя. У абрадзе ваджэння апошняга яскрава выяўлялася мясцовая спецыфіка: *«Калі вадзілі мядзведзя, то возьмуць шубу, адну на ногі ў рукавы ўдзенуць, а другую – на рукі, вывернуць ды падпярэжуцца – гэта ўжо мядзведзь, тады ўжо ідуць у хату і кажуць мядзведзю: "Ну-ка, Міша, як ты пчол абмахваеш?" Мядзведзь павінен паказваць. Потым пытаюць: "Міша, як ты танцуеш?" А мядзведзь тады ўжо пойдзе танцаваць і робіць ўсё, што яму загадваюць»* (зап. ад Л. І. Гусаковай).

Паводле ўспамінаў Надзеі Нікіфараўны Салодкінай, 1926 г. н., з вёскі Неглюбка, *«у нашай вёсцы хлопцы шчадруюць аддзельна ад дзяўчат, а дзяўчаты хадзілі асобным гуртом і спявалі шчадроўкі»*. Звычайна, калі шчадравалі, то вадзілі казу: *«Вадзілі казу. Хлопцы хадзілі. Хлопца надзенуць, шубу вывярнуць, надзенуць, і на галаву, на лоб, патыліцу і віскі тут цвятоў насодзяць ёй, і рогі здзелаюць. Вот оні ўжо прыходзяць у хату: "Добры вечар!" – і пяюць:*

*Го-го-го, каза,*

*Го-го-го, серая.*

*А дзе ж ты была?*

*У турэцкай зямле.*

*Што ты там ядала?*

*Ягадкі збірала.*

*Каму ж ты там давала?*

*Жаўнерам, жаўнерам,*

*Тым разбойнічкам»* (в. Глыбаўка) [1, с. 98].

У сістэме калядна-навагодняй абраднасці Веткаўшчыны шлюбная варажба, прымеркаваная да Новага года, вызначаецца багаццем лакальных асаблівасцей. Г. А. Барташэвіч адзначыла, што «калі ў варожбах на гаспадарчую тэму галоўная роля належала дарослым, у першую чаргу гаспадару сям'і, то ў варожбах пра шлюб удзельнічала моладзь» [2, с. 156]. Варажылі, выкарыстоўваючы розныя прадметныя атрыбуты: хусткі (*«Развязвалі платкі свае і клалі ў начовачкі і палалі. Чый першы выпадзе, той першы пойдзе замуж»* – зап. ад В. Р. Воінавай у г. Ветка); бліны (*«З блінамі бегалі пад акно слухаць к саседзям. Еслі скажуць "ідзі", то пойдзеш замуж у гэтым годзе, а еслі "сядзь", то не пойдзеш»* – зап. ад В. Р. Воінавай); дровы (*«Дзяўчаты ішлі ў драўнік і ўпоцемках набіралі ахапку дроў. Прыносілі іх у хату і лічылі. Калі паленцаў было чотнае чысло, то в этым годзе дзяўчына выйдзе замуж»* – зап. у г. Гомель ад Г. І. Данілёнак, 1946 г. н., пражывала ў в. Гарысты); абутак (*«Дзяўчаты выходзілі на двор і праз вароты кідалі валенкі. У які бок пакажа насок валенка, у той бок дзяўчына выйдзе замуж»* – зап. ад Г. І. Данілёнак); грэбень (*«Яшчэ клалі пад галаву рашчоску-грыбяшок, прасілі, каб прысніўся суджаны»* (в. Залаты Рог) [1, с. 32]; люстэрка (*«Яшчэ гадалі з зеркалам. Ноччу ў 12 часоў дзеўкі ішлі ў баню і там гадалі. Бралі зеркала вялікае і адно малое, ставілі на стале. Перад вялікім зеркалам – свечку гряную. Запальвалі свечку, дзеўкі глядзелі ў зеркала і нават маглі ўбачыць свайго жаніха»* (в. Шарсцін) [1, с. 83]).

Пры дапамозе варажбы імкнуліся вызначыць, які характар у свекрыві, у дадзеным выпадку выконвалі маніпуляцыі з камнем (*«Потым у крыніцу камень маленькі кідалі: калі ціха на дно пойдзе, то і свякруха будзе ціхая, а калі "б-р-р-р", то свякруха бурчэць будзе»* (в. Новы Мір) [1, с. 36]), а таксама дзяўчаты хацелі даведацца пра тое, які іх чакае лёс, ці будзе шчаслівым сямейнае жыццё (*«Карову хадзілі ў хляву цапалі, калі хвост – мужык хвастлівы будзе, за рогі – бедна будзеш жыць, за галаву, шыю – добра будзеш жыць»* (в. Неглюбка) [1, с. 53]).

Іншы раз шлюбная варажба праводзілася з выкарыстаннем свойскіх жывёл і птушак (сабакі, курыцы або пеўня): *«Бліны кідалі сабаку. Ну, і чэй блін яна схваціць, тая і пойдзе первая замуж з усіх»* (в. Старое Сяло) [1, с. 41]; *«Насыпалі ў хаце тры кучкі зерня і ставілі пеўня. Ён ходзе і ходзе, у адной кучцы можа адзін раз клюнуць, другую тоже, а трэцюю размятаў па ўсёй хаце. Так і выходзіць: одна сестра выходзіць замуж, другая выходзіць, а трэцяя застаецца старай дзевай»* (зап. ад Ульяны Іванаўны Аніськовай, 1940 г. н., у в. Стаўбун).

Трэцюю куццю, якая была прымеркавана да Вадохрышча, называлі на Веткаўшчыне «вадзяной», або «галоднай». Паводле сведчанняў Івана Фёдаравіча Шаўцова, 1956 г. н., з вёскі Неглюбка, *«18 января пачыналася посная Куцця. Зноў варылі куццю. Не елі, пакуль не пасвецяць у царкве ваду. А тады ваду лінуць 3 разы, умыюцца і ядуць куццю»*. Сярод рытуалаў, звязаных з трэцяй куццёй, вылучым наступныя: пасвячэнне вады ў царкве (*«Трэцяя куцця на Хряшчэнне. Уранні бегаюць усе за вадой пасвяцонай у царкву. Прынясуць з царквы, адап'юць, каб не балець, а тую, што астанецца, хаваюць. Як хто забалее, так ваду тую піць даюць»* (в. Новы Мір) [1, с. 37]); маляванне крыжыкаў на вокнах і сценах (*«Я ўжо пастаўлю куццю на стол і тады хаджу ўжо к кожнаму акну і на кут, і хрэсцілі мелам»* (в. Новы Мір) [1, с. 48]); выпяканне крыжыкаў з цеста (*«Выпякалі з цеста крыжы»* (в. Стаўбун) [1, с. 102]); высяканне на рэчцы *«хрэста бальшузнага з лёда»* і абліванне яго буракувым расолам (в. Новы Мір) [1, с. 48]; апырскванне пасвечанай вадой хаты (*«вадой пасвеціш у хаце»*) і гаспадарчых пабудоў, каб *«скот здаровы быў, штобы людзі здаровыя былі – вот так»* (в. Новы Мір) [1, с. 49]. На пытанне, чаму малявалі крыжыкі, інфарманты адказвалі, што гэта абазначала, што калядныя святкаванні ўжо закончыліся: *«На апошнюю куццю бацька мелам крэсцік рысаваў – гэта значыла, што Каляды скончыліся»* (г. Ветка) [1, с. 93]. Намаляваныя крыжыкі не толькі выконвалі функцыю сімвалічнага абярэга, але і сімвалізавалі завяршэнне калядных святкаванняў.

Сярод значнага па колькасці фактычнага матэрыялу сустрэліся адзінкавыя сведчанні наконт запальвання менавіта навагодняга вогнішча, у прыватнасці, у вёсцы Перавессе: *«Шчэ трынаццатага вечарам палілі касцёр. Усе прыгалі цераз касцёр. Лічылі, што ўсё плахое згарае ў ім. Прыгалі, штоб балезней не было»* [1, с. 78]. Прыведзены прыклад пацвярджае, што скокі праз касцёр мелі на мэце пазбавіцца ад усяго дрэннага і засцерагчыся ад хвароб.

Важным структурным кампанентам калядна-навагодняй абраднасці Веткаўшчыны з'яўляліся прыкметы і павер'і, звязаныя з гаспадарчымі клопатамі нашых продкаў. Яны нават у межах вёсак аднаго раёна мелі разнастайную матывіроўку, што было прадыктавана, у першую чаргу, дыялектным характарам народнай культуры. М. І. Талстой слушна падкрэсліваў, што «ўся народная культура дыялектная па характары, што ўсе яе з'явы і формы функцыянуюць у выглядзе варыянтаў, тэрытарыяльных і ўнутрыдыялектных варыянтаў з няроўнай ступенню адрознення. Гэта знаходзіць сваё яркае адлюстраванне ў фальклоры, у якім рэальна бытуюць шматлікія варыянты тэкстаў» [3, с. 20]. Асабліва гэта датычыць каляндарных прыкмет і павер'яў, сведкаў сівой даўніны, якія «могуць праліць святло на лад жыцця нашых продкаў, іх спосабы гаспадарання і культурнага існавання» [4, с. 13]. Напрыклад, сярод прыкмет і павер'яў, звязаных з трэцяй куццёй, у вёсцы Стаўбун адзначаюцца наступныя: *«Кашу прыбіраем, нясом вутрам курам, гусям, сыплем у кружок, штоб не бегалі з свайго двара, і прыгаворвалі: "Колькі на Хрышчэнне ў кашы крупінак, штоб столькі ў мяне было гусянятак"»*; *«Як цёлачка з'явілась на падвор'і, тады стол абвязваюць, путаць харашо: "Як стол стаіць недвіжыма, штоб і ты, як хазяйка дае есці, не брыкалася, стаяла»*; *«Вутрам сыпалі дзецям арэхі, семкі, тады дзеці кідаюцца. Вот як дзеці кідаюцца хапаць арэхі, семачкі, каб так вяліся і брыкаліся ў хазяйкі цяляткі»* (зап. ад Марыі Лаўрэнцьеўны Зуевай, 1927 г. н.).

Прааналізаваныя фактычныя матэрыялы па калядна-навагодняй абраднасці Веткаўскага раёна даюць падставы пераканацца ў актуальнасці

вывучэння мясцовай спецыфікі каляндарна-абрадавага фальклору, у прыватнасці, асобных раёнаў не толькі Гомельскай вобласці, але і іншых рэгіёнаў Беларусі. Каб атрымаць больш падрабязную карціну бытавання і захавання ў народнай памяці, напрыклад, зімовых абрадаў, звычаяў, песень, неабходна пазнаёміцца з фактычным матэрыялам, запісаным у шматлікіх вёсках, што дазволіць выявіць як агульнаэтнічнае, так і непаўторнае мясцовае.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Вечнае: фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / аўт.-уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – 362 с.
2. Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / Л. П. Барабанава [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.
3. Толстой, Н. И. Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – М. : Индрик, 1995. – 509 с.
4. Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., перакл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – Кн. 2. – 607 с.



РЕЗЮМЕ

В статье охарактеризованы местные особенности колядно-новогодней обрядности одного из районов Гомельской области – Ветковского. На основе богатого фактического материала, записанного в полевых экспедициях в разных населённых пунктах, рассматриваются отдельные структурные компоненты колядного обрядового комплекса и связанные с ними приметы и поверья.



SUMMARY

The article describes the local features related to the carol and New Year rituals of Vetka, Gomel region. It is based on the rich factual material recorded during field expeditions in different settlements. The individual structural components of the carol ritual complex, the signs and beliefs associated with it are studied in the article.